## ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

С.Я. Новікаў

# РЭГІЯНАЛЬНАЯ ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: АРЫГІНАЛЬНЫ НАВУКОВЫ ПОГЛЯД[1]

Летам 2009 г. у выдавецтве „Ferdinand Schöningh“ выйшла ў свет грунтоўная манаграфія маладога нямецкага даследчыка Аляксандра Бракеля, прысвечаная рэгіянальнай гісторыі Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны.

Аўтар манаграфіі зазначае, што на працягу двух перадваенных гадоў і трох гадоў германскай акупацыі мясцовае насельніцтва Баранавіцкай вобласці і акругі “Баранавічы” перажыло цяжкія наступствы панавання дзвюх улад і знаходзілася ў фокусе антаганістычных светапоглядаў дзвюх сістэм цягам значнага часу. Той час пакінуў адметныя сляды ў жыцці мясцовых жыхароў. Створаная ў снежні 1939 г. Баранавіцкая вобласць узнікла ў значнай ступені на тэрыторыі польскага ваяводства Навагрудак і ўключала 8 уездаў (Баранавічы, Валожын, Ліда, Навагрудак, Нясвіж, Слонім, Стоўбцы і Шчучын) агульнай плошчай 23,3 тыс. км$^2$ і насельніцтвам у 1,18 млн чалавек. Падчас германскай акупацыі на гэтай тэрыторыі былі створаны акругі Баранавічы, Ліда, Слонім і Навагрудак. Акруга Баранавічы складала 6 тыс. км$^2$ з насельніцтвам каля 350 тыс. чалавек. Аўтар вылучае мясцовае насельніцтва ў якасці галоўнага прадмета вывучэння цягам пяці гадоў, не пакідаючы па-за рамкамі даследавання цэлы шэраг малавядомых пытанняў.

Падставай для грунтоўнага аналізу і прапанаваных вывадаў, зробленых аўтарам у даследаванні, з’яўляюцца разнастайныя архіўныя крыніцы, большасць з якіх маюць беларускае паходжанне, а таксама вялікая колькасць спецыяльнай навуковай літаратуры. Зазначым, што гісторык здолеў упершыню ўвесці ў шырокі навуковы ўжытак значны пласт новых матэрыялаў, выяўленых у 84 архіўных фондах у Баранавічах, Берліне, Брэсце, Варшаве, Людвігсбургу, Мінску і Фрайбургу.

Работа складаецца з 7 частак, некаторыя з іх падзелены на раздзелы і больш дробныя падраздзелы. Заключаюць працу скарачэнні, спіс крыніц і літаратуры, імянны спіс.

Ва Уводзінах (с. 1–14) аўтар спыняецца на асобных працах тых, хто ў сваіх даследаваннях прама ці ўскосна закранаў асобыя аспекты гісторыі *крэсаў усходніх* за савецкім часам і цягам германскай акупацыі: польскіх гісторыкаў Ю. Туронка і Б. Мусяла, нямецкіх даследчыкаў Х. Герлаха,

[1] *Brakel, A.* Unter Rotem Stern und Hakenkreuz: Baranowicze 1939 bis 1944. Das westliche Weißrussland unter sowjetischer und deutscher Besatzung / A. Brakel. – Paderborn; München; Wien; Zürich: Ferdinand Schöningh. – 2009. – 426 S.

Б. К'яры, П. Коля, амерыканскага гісторыка М. Дзіна, а таксама беларускіх даследчыкаў – С. Барадзіна, А. Кавалені, М. Літвіна, Я. Розенблата, І. Сервачынскага, І. Яленскай. Кожны з іх унёс пэўны ўклад у распрацоўку асобных аспектаў гісторыі германскага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі заходняй Беларусі, аднак у публікацыях быў выключэннем, чым правілам параўнаўчы аналіз гістарычных падзей за перадваенным і ваенным часам на тэрыторыі адной Баранавіцкай вобласці. Апрача таго, ва ўводзінах аўтар дае агляд асноўных дакументальных крыніц, выкарыстаных у даследаванні.

У другой частцы "Крэсы ўсходнія ў II Рэчы Паспалітай" (с. 15–27) аўтар выяўляе прыкметы нацыянальнага характару мясцовага насельніцтва, паказвае яго моўныя і канфесійныя адметнасці. Так, у пачатку 1930-х гг. у ваяводстве Навагрудак гэтыя дзве катэгорыі прыкмет не былі пастаяннымі і вагаліся: 550 тыс. чалавек лічылі сваёй мовай польскую, але толькі 420 тыс. спавядалі рымска-каталіцую рэлігію; 413 тыс. размаўлялі па беларуску, але 542 тыс. мясцовага насельніцтва з'яўляліся праваслаўнымі вернікамі. У яўрэяў, якія пражывалі на гэтай тэрыторыі, такіх адрозненняў не назіралася.

У трэцяй часты даследавання "Баранавічы ў Другой сусветнай вайне" А. Бракель дае кароткі агляд галоўных падзей на тэрыторыі Баранавіч і вобласці ў пачатку Другой сусветнай вайны (с. 29–33). З верасня 1939 г. тут пачалі адбывацца падзеі, якія пакінулі істотны след у гісторыі насельніцтва Баранавіцкай вобласці, у склад якой у студзені 1940 г. былі канчаткова ўключаны 27 беларускіх раёнаў. З моманту яе ўключэння ў склад БССР пачалася "маштабная саветызацыя" былых крэсаў усходніх. З 28 чэрвеня 1941 г. Баранавіцкая вобласць трапляе ў цэнтр вайны светапоглядаў. У акругу Баранавічы ўвайшлі разам з горадам 7 раёнаў, у тым ліку: Навагрудак, Клецк, Ляхавічы, Мір, Нясвіж, Новая Мыш і Стоўбцы. Праз некаторы час у Баранавічах ствараецца пост камендатуры паліцыі бяспекі Мінску. Апрача таго, цягам некалькіх месяцаў у акрузе былі створаны пасты жандармерыі і ахоўнай паліцыі. Пры гэтым, калі ў першым выпадку размова ішла выключна аб нямецкіх служачых, дык у другім – аб служачых мясцовага паходжання.

Разам з усталяваннем улады вобласць апынулася ў сферы значнай трансфармацыі, звязанай: па-першае, з вынішчэннем яўрэяў на тэрыторыі захопленых крэсаў усходніх; па-другое, з пачаткам разгортвання партызанскага руху; па-трэцяе, у сувязі з ростам уплыву барацьбы польскага супраціўлення Арміі Краёвай. У такіх умовах немцам прыходзілася праводзіць сваю палітыку ўсімі наяўнымі сродкамі і з вялікай жорсткасцю (с. 32). Але гвалт і жорсткасць з'яўляліся толькі адной часткай нямецкай акупацыйнай палітыкі. Акупанты спрабавалі таксама рознымі сродкамі ўключыць мясцовае насельніцтва ў сістэму новых адносін. Такое становішча цягнулася да 8 ліпеня 1944 г., калі г. Баранавічы быў вызвалены ад нямецкіх захопнікаў і пачаўся этап рэсаветызацыі вобласці.

У чацвёртай частцы "Нацыянальная палітыка і нацыянальныя канфлікты" (с. 35–145) заслугай А. Бракеля з'яўляецца спроба высвятлення адносін паміж палякамі, яўрэямі і беларусамі за часам савецкага і нямецкага

панавання і ўстанаўлення галоўных прычын канфліктаў. У першым раздзеле ідзе размова аб нацыянальнай палітыцы савецкай улады з 1939 па 1941 г. Агульная колькасць высланых з тэрыторыі Баранавіцкай вобласці восенню 1939 г. складала 16 693 чалавекі. У пачатку 1940 г. пачаліся новыя хвалі дэпартацыі, калі ў лік дэпартаваных патрапілі ў асноўным афіцэры польскіх вайсковых фарміраванняў (войска польскага). Іх дэпартацыя пачалася 13 красавіка 1940 г. і была завершана ў асноўным у гэты ж дзень, цягам якога з тэрыторыі Заходняй Беларусі былі дэпартаваны і адпраўлены ў Казахстан 28 112 чалавек, з якіх 9309 паходзілі з Баранавіцкай вобласці. Трэцюю хвалю складалі "высяленцы", большай часткай якіх былі яўрэі. Да студзеня 1940 г. на тэрыторыю Заходняй Беларусі з Польшчы патрапіла амаль 73 000 бежанцаў, з якіх большасць складалі яўрэі. Звыш 26 тыс. з іх апынулася на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці (с. 53). Аўтар сцвярджае, што ў ходзе дэпартацый адбывалася перапляценне розных катэгорый дэпартаваных па палітычных, сацыяльных і этнічных прыкметах, але датычылася гэта галоўным чынам палякаў, а не яўрэяў і беларусаў.

У даследаванні паказана, што асаблівую ўвагу савецкая ўлада надавала школьнай і адукацыйнай палітыцы. Бальшавікі пры гэтым, з аднаго боку, зыходзілі з агульнага доступу ўсіх сацыяльных слаёў да адукацыі, а з другога – хацелі праз школьную палітыку ўплываць на культуру карэннага насельніцтва, якая асабліва цярпела за польскім часам. Усе нацыянальныя групы (беларусы, рускія, яўрэі і палякі) павінны мець магчымасці для атрымання школьнай адукацыі на сваёй роднай мове. З прыходам савецкай улады гэта азначала тое, што ва ўсіх школах абавязковымі павінны быць заняткі на беларускай і рускай мовах.

Асабліва цікавым падаецца нам матэрыял, у якім А. Бракель даследуе пытанне аб супрацоўніцтве яўрэяў з органамі савецкай улады. Для гэтага выкарыстоўваюцца дакументы аб асабістым складзе супрацоўнікаў аддзела работы з кадрамі. Так, да канца 1940 г. у Баранавіцкую вобласць было накіравана 8606 "усходнікаў", з якіх 4 тыс. былі беларусамі, наступныя 3 тыс. – рускімі і толькі 875 – яўрэямі (с. 89). У гэтым аспекце гісторык прыходзіць да высновы, што разгляд яўрэяў як "савецкіх калабарантаў" з'яўляецца ні больш чым стэрэатыпам (с. 90).

Адказваючы на пытанне аб адносінах паміж нацыянальнымі групамі ў гады панавання савецкай улады, даследчык зыходзіць з тэзы аб магчымасці існавання пэўнага канфлікту ў сувязі з падзелам грамадства на пераможцаў і пераможаных, прыхільнікаў і праціўнікаў новага парадку. Лінія падзелу пры гэтым праходзіла з улікам сацыяльных крытэрыяў, якія ў большасці сваёй мелі этнічнае паходжанне. Аўтар паказвае: калі польская ўлада імкнулася цягам 20-ці гадоў зрабіць беларусаў палякамі, што давалася даволі цяжка, дык камуністам гэта ўдалося за некалькі тыдняў свайго ўладарання (с. 94).

Разглядаючы наступствы нацыянальнай палітыкі нямецкіх акупантаў з 1941 па 1944 гг., аўтар зыходзіць з тэзы аб тым, што нацыянальнае пытанне нямецкія нацыянал-сацыялісты разглядалі інакш, чым прадстаўнікі

камуністычнай ідэалогіі. Калі бальшавікі гэта пытанне бачылі скрозь прызму імкнення да роўнасці народаў, дык ідэолагі нацыянал-сацыялізму вызначалі ролю кожнай расы ў адпаведнасці з расавай тэорыяй. Нацысцкая канцэпцыя несла бяду жыхарам усходніх крэсаў, паколькі славянскія народы належалі да расы "недачалавекаў", роля якіх у "Новай Еўропе" вызначалася сярод народаў-рабоў, якія падлягалі вынішчэнню.

Інакш вызначалася сітуацыя з яўрэямі. Аўтар паказвае трагічную гісторыю яўрэяў акругі Баранавічы на дакладных прыкладах, раскрываючы этапы масавага вынішчэння яўрэйскага насельніцтва. Шукаючы адказ на пытанне аб стаўленні мясцовага насельніцтва да праяў Халакосту, аўтар прыходзіць да высновы аб тым, што даволі складана даць адзіную абагульняючую ацэнку ў дачыненні да пазіцыі і адносін неяўрэйскага насельніцтва да лёсу яўрэяў. За часам нямецкай акупацыі антысемітызм не стаў для мясцовага насельніцтва тым фактарам, які мог бы прывесці да "працэсу вынішчэння" яўрэяў (с. 119).

Як паказвае прыклад акругі Баранавічы, у немцаў фактычна не існавала адзінай пазіцыі адносна палякаў і беларусаў. У гэтым сэнсе з'яўляецца даволі важным вывад аўтара, які сведчыць аб фактычнай адсутнасці "вялікіх нацыянальных канфліктаў". Тыя канфлікты, якія ўсё-такі мелі месца ў адносінах паміж палякамі і беларусамі, мелі сацыяльнае ці рэлігійнае паходжанне. Адным з адказаў на такое становішча з'яўлялася нямецкая палітыка, якая была ў тысячу разоў хужэйшай за савецкую ўладу (с. 145).

У пятай частцы надзвычай цікавым выглядае зварот А. Бракеля да разгляду "форм супрацоўніцтва з уладамі" (с. 161–244). Сутнасць такога супрацоўніцтва раскрываецца на розных фактах добраахвотнай кааперацыі з савецкай уладай у 1939–1941 гг. і кааперацыі з нямецкай уладай у гады германскай акупацыі ў 1941–1944 гг. Гісторык пры такім падыходзе зыходзіць з тэзы аб тым, што і савецкая, і нямецкая ўлады кіраваліся адзіным правілам – пошукам падтрымкі сярод мясцовага насельніцтва. Пры гэтым аўтар свядома не выкарыстоўвае тэрмін *калабарацыя*, уводзячы замест гэтага такія дэфініцыі, як *супрацоўніцтва* і *кааперацыя*.

Разглядаючы формы супрацоўніцтва з савецкай уладай, аўтар падзяляе гэтую сферу на некалькі палёў, дзе магла адбывацца сумесная работа мясцовага насельніцтва з новай уладай і складвалася шырокая панарама розных відаў кааперацыі. Галоўнай сваёй задачай з першых дзён савецкая ўлада бачыла стварэнне паўнавартаснай сістэмы, якая б садзейнічала поўнай палітычнай, адміністратыўнай і гаспадарчай інкарпарацыі заходніх зямель у склад Савецкай Беларусі. З мэтай кантролю за развіццём палітычных працэсаў ствараліся сельскія і гарадскія выканаўчыя камітэты.

А. Бракель паказвае тыя групы насельніцтва, якія ў першую чаргу падтрымлівалі носьбітаў камуністычнай ідэалогіі. Да ліку тых, хто быў гатовы ёй служыць, а гэта ў першую чаргу камуністы, камсамольцы і агітатары, аўтар адносіць амаль 11 тыс. чалавек. Але гэта была толькі адна сотая частка ад агульнай колькасці насельніцтва Баранавіцкай вобласці (с. 175).

Усталяванне нямецкай акупацыйнай улады з'явілася для многіх той вяхой, якая сведчыла аб спыненні прымусовага прыцягнення сялян у калгасы, рэпрэсій у дачыненні да вернікаў, забароны рэлігіі і дзейнасці цэрквы. Але ў хуткім часе мясцовае насельніцтва было вымушана пайсці на прымусовую кааперацыю з нямецкай уладай. Так, на тэрыторыі акругі Баранавічы, падзеленай на 7 раёнаў (Гарадзішчы, Клецк, Ляхавічы, Мір, Нясвіж, Новая Мыш, Стоўбцы), знаходзіліся 58 абшчын і каля 13 тыс. вёсак, дзе існавала мясцовае кіраўніцтва. Якія фактары прывялі да добраахвотнага супрацоўніцтва і кааперацыі, аўтару вызначыць не ўдаецца з-за недахопу крыніц, паколькі гэта датычылася антыбальшавізму, помсты, кар'ерызму і ўмення прыстасоўвацца (с. 193).

Аўтар не абыходзіць увагай і даволі складанае пытанне ў сферы супрацоўніцтва – удзел у злачынствах тых мясцовых жыхароў, хто пайшоў служыць у дапаможную паліцыю. У працы высветлены галоўныя прычыны ўзброенага супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва з немцамі. Сярод тых, хто ішоў на службу да немцаў былі тыя, хто кіраваўся палітычнымі матывамі ўступлення ў дапаможную паліцыю. На думку А. Бракеля, існавала дзве процілеглыя групы. Першая ўключала ў сябе беларускіх нацыяналістаў, якія праз службу на немцаў бачылі магчымасць весці таксама барацьбу са сваімі ідэйнымі праціўнікамі. Менавіта ва ўзброеных паліцэйскіх фарміраваннях ім бачыўся першы крок да стварэння ўласнага беларускага войска (с. 203). Другую групу складалі палякі, якія супрацоўнічалі з акупантамі па нацыянальных перакананнях, у першую чаргу з мэтай вяртання ўсходніх крэсаў, страчаных у 1939 г. Таму дзеля атрымання зброі палякі ўступалі адначасова і ў нямецкую паліцыю, і ў польскую Армію Краёвую.

З ростам актыўнасці партызан у сярэдзіне 1942 г. павялічыліся шэрагі паліцэйскіх фарміраванняў. У акрузе Баранавічы гэты рост не набыў асобых маштабаў, а вырас толькі з трох соцень да 816 паліцаяў службы аховы. Пры гэтым аўтар выяўляе важную тэндэнцыю адносна таго, што ў параўнанні з першым годам нямецкай акупацыі практычна зніклі добраахвотнікі. Гэта падштурхнула немцаў да ўвядзення абавязку па прызыве ў паліцыю ваеннаабавязаных мужчын. З 8 ахоўных батальёнаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь, месцам дыслакацыі батальёна № 60 з'яўляліся Баранавічы і Сноў. Пры іх камплектаванні немцам прыходзілася звяртацца да мераў прымусовага рэкрутавання (с. 205).

Адносіны беларускіх нацыяналістаў з акупантамі аўтар раскрывае на прыкладах супрацоўніцтва нямецкай акупацыйнай улады і такіх утварэнняў, як Беларуская нацыянальная самапомач (с. 206–210), Беларуская самаахова (с. 210–212), Беларускі саюз моладзі (с. 214–219), Беларуская цэнтральная Рада (с. 219–220), Беларуская самаахова (с. 220–224). Пры гэтым гісторык прыводзіць дакументальныя звесткі аб удзеле ў гэтых утварэннях жыхароў Баранавіцкай акругі. Цікавым падаецца далучэнне нямецкага даследчыка да дыскусіі сярод беларускіх, польскіх і нямецкіх навукоўцаў адносна колькасці беларускай моладзі, якая ўваходзіла ў склад Беларускага саюза моладзі.

На думку А. Бракеля, на тэрыторыі акругі Баранавічы агульная колькасць удзельнікаў гэтага саюзу не пераўзыходзіла 3 тыс. чалавек (с. 215).

Апрача добраахвотнай кааперацыі і супрацоўніцтва аўтар разглядае і факты прымусовай работы мясцовага насельніцтва пад нямецкай акупацыяй. Пры гэтым колькасць тых, хто вымушаны быў пайсці на такое "прымусовае супрацоўніцтва", значна перавышае лічбу мясцовых грамадзян, хто нёс службу ў паліцыі аховы ці быў уключаны ў сферу мясцовага кіравання. Паводле планаў вермахта, мясцовая працоўная сіла павінна была рэкрутавацца з акупаванай тэрыторыі ці прыцягвацца з выкарыстаннем сілы. Асновай для гэтага з'яўлялася распараджэнне А. Розенберга аб ўвядзенні абавязковай працоўнай павіннасці для жыхароў Рэйхскамісарыяту Остланд ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў, тады як для яўрэяў гэтыя рамкі былі пашыраны з 15 да 60 гадоў. Тут неабходна звярнуць увагу чытача на недакладнасць, дапушчаную А. Бракелем у дачыненні да даты выдачы распараджэння: гэта было не 5 верасня 1941 г. (с. 225), а месяцам раней[1].

Аўтар паказвае агульную карціну прыцягнення мясцовага насельніцтва да прымусовай працы, параўноўваючы колькасныя паказчыкі аб грамадзянах Баранавіцкай акругі на работах ў рэйху і аб прыцягненні насельніцтва ў розных галінах вытворчасці і сельскай гаспадаркі на месцы. Калі немцам удалося дэпартаваць у рэйх з акругі ўвогуле каля 17 тыс. чалавек, што складала 14 % ад вывезеных на прымусовыя работы з тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь, дык да канца 1943 г. на тэрыторыі акругі Баранавічы было зарэгістравана 134 тыс. мясцовай рабочай сілы, з якой 95 тыс. былі заняты ў сельскай гаспадарцы (с. 237).

У заключэнні пятай часткі А. Бракель прыводзіць да высновы, што нават пры ўмове наяўнасці фактаў аб добраахвотным супрацоўніцтве часткі насельніцтва з савецкай і нямецкай уладамі, імкненні немцаў да прымусовага і гвалтоўнага выкарыстання мясцовага насельніцтва былі непараўнальна большымі, чым у Саветаў (с. 244).

Шостую частку даследавання аўтар прысвячае розным праявам "незадавальнення, адхілення і супраціўлення мясцовага насельніцтва" (с. 245–380), якія мелі месца ў гады савецкай улады і за часам германскай акупацыі Баранавіцкай вобласці. Аналізуючы асобныя факты адхілення савецкай улады і арганізаванага супраціўлення ёй пасля ўключэння ўсходніх крэсаў у склад Савецкай Беларусі, а таксама параўноўваючы іх з маштабамі ўзброенага супраціву на беларускай зямлі нямецкім акупантам, гісторык прыходзіць да высновы аб тым, што ў гады германскай акупацыі ўзброенае супраціўленне набыло адметныя маштабы (с. 246). У першым выпадку аўтар называе лічбу ў 188 груп з 5158 удзельнікамі, якія на тэрыторыі ўсёй Заходняй Беларусі аказвалі супраціўленне савецкай уладзе на працягу першага года пасля яе ўсталявання. Аб незадавальненні мясцовага насельніцтва савецкай уладай сведчаць шматлікія скаргі, папрокі і звароты.

---

[1] Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі (LVVA). – P-70. – Apr. 5. – Lieta 7. – L. 20 op.: Verordnung über die Einführung der Arbeitspflicht in den besetzten Ostgebieten, vom 5. August 1941.

Асаблівае незадавальненне насельніцтва праявілася ў пытанні рэлігіі і царквы, куды адразу пачала актыўна ўмешвацца савецкая ўлада з мэтай пазбаўлення веры ў насельніцтва: па-першае, ствараючы татальную сістэму кантролю за вернікамі; па-другое, прымаючы адміністратыўныя меры, накіраваныя не столькі супраць вернікаў, колькі супраць царквы і яе службаў; і па-трэцяе, праводзячы сярод вернікаў асветную работу дзеля адмаўлення ад "ерасі" (с. 251). У выніку правядзення такіх мерапрыемстваў у лютым 1941 г. агульная колькасць рэлігійных устаноў вызначала наступную карціну: у Баранавіцкай вобласці дзейнічалі 162 праваслаўных і 130 каталіцкіх цэркваў, 136 сінагог, у якіх адпраўлялі службу 157 праваслаўных свяшчэннікаў, 127 прэсвітэраў і 92 рабіна. На думку нямецкага гісторыка, гэтыя лічбы сведчаць аб не зусім пераканаўчым выніку барацьбы бальшавікоў супраць рэлігіі.

Паказваючы прычыну незадавальнення палітыкай у галіне сельскай гаспадаркі, А. Бракель аналізуе ход пераўтварэнняў на вёсцы, дзе пасля верасня 1939 г. шырока праводзілася сацыялістычная калектывізацыя шляхам стварэння калгасаў і саўгасаў. У Баранавіцкай вобласці, якая, хоць і была лідэрам па правядзенні калектывізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, аднак па стане на 1 чэрвеня 1941 г. у калгасы і саўгасы ўвайшлі толькі 6,5 % ад усіх сялянскіх двароў (с. 261). Асаблівае непрыняцце пры гэтым выклікала стварэнне калгасаў. Сярод прычын незадавальнення аўтар таксама называе доўгія чэргі і пустыя паліцы ў крамах і гандлёвых лаўках, створаных у рамках сацыялістычнай "дэфіцытнай гаспадаркі" (с. 268). Даволі высокую ступень непрыняцця новых парадкаў падчас праведзеных Саветамі выбараў праяўлялі жыхары вёсак, населеных польскім насельніцтвам (с. 276). Шматлікія прыклады і іх грунтоўны аналіз пераконваюць А. Бракеля ў тым, што непрыняцце ўлады камуністаў у Баранавіцкай вобласці было відавочным (с. 279). Але канец савецкай улады наступіў у выніку ўмяшання знешняга фактару – нашэсця германскага вермахта.

Але цалкам вызваліць тэрыторыю Баранавіцкай вобласці ад савецкага ўплыву немцам не ўдалося нават пасля яе поўнага захопу летам 1941 г. Савецкі партызанскі рух з'яўляўся вызначальнай прыкметай не толькі барацьбы, але і захавання савецкай спадчыны на заходняй тэрыторыі.

Партызанская вайна стала сімвалічным знакам перыяду германскай акупацыі Баранавіцкай вобласці. Паводле нямецкіх дакументаў, актыўная дзейнасць партызан на гэтай тэрыторыі становіцца фактам толькі з вясны 1942 г. (с. 286). Да лета агульная колькасць партызан не пераўзыходзіла тысячы чалавек. А. Бракель лічыць, што да ліку важных адметнасцей партызанскай барацьбы на тэрыторыі акругі адносіцца стварэнне першага яўрэйскага атрада пад кіраўніцтвам братоў Бельскіх (с. 287). Апрача таго, нямецкі аўтар не пагаджаецца з думкай, якая пануе ў беларускай гістарыяграфіі адносна таго, што летам 1942 г. можна весці размову аб "маналітным, скаардынаваным і баяздольным руху супраціўлення" (с. 288). У шматлікіх выпадках гэта супярэчыць фактам, паколькі на той час была

даволі значная частка невялікіх і малаўзброеных груп. Але нягледзячы на гэтыя цяжкасці і перашкоды, менавіта пачатак 1942 г. можна лічыць рубяжом, калі значная частка партызан перамяшчае фокус узброенага супраціўлення з барацьбы за сваё выжыванне на барацьбу супраць акупантаў. Да таго ж з мэтай каардынацыі партызанскага руху ў канцы мая 1942 г. ствараецца Цэнтральны штаб партызанскага руху на чале з П.К. Панамарэнкам.

Разглядаючы развіццё партызанскага руху з восені 1942 г. па пачатак 1943 г., нямецкі аўтар прыходзіць да высновы аб тым, што за гэты час не толькі павялічылася колькасць партызан, узмацнілася іх баяздольнасць, але і намеціўся важны элемент у савецкім партызанскім руху – падпарадкаванне суцэльнай веры ідэям камуністычнай партыі. Аднак на тэрыторыі Баранавіцкай акругі мелася група барацьбітоў, якія катэгарычна не пагаджаліся з гэтым – польскае ўзброенае падполле Арміі Краёвай (с. 312). Хаця і савецкі партызанскі рух, і польскае ўзброенае падполле бачылі сваім галоўным ворагам нямецкіх акупантаў, аднак мэты іх былі рознымі ў дачыненні да палітычнага і тэрытарыяльнага лёсу ўсходніх крэсаў у пасляваенны час: для удзельнікаў польскага супраціву крэсы павінны былі заставацца польскімі, савецкі бок бачыў тут толькі камуністычную перспектыву (с. 315). У далейшым гэта вылілася ў зацятую ўзброеную барацьбу паміж фарміраваннямі Арміі Краёвай і падраздзяленнямі савецкіх партызан. Узброеная напружанасць паміж імі захоўвалася практычна да канца германскай акупацыі Баранавіцкай вобласці. На думку аўтара, на тэрыторыі акругі Навагрудак падпольныя часці Арміі Краёвай заставаліся моцным і баяздольным узброеным кулаком польскага падполля (с. 331).

Фактычнае ваеннае значэнне партызанскай вайны А. Бракель спрабуе высветліць на аснове дакументальных фактаў, выяўленых ім у розных архівах і праверaных у гістарыяграфічных крыніцах. Паводле дакументаў і найноўшых нямецкіх даследаванняў, не вытрымлівае крытыкі сцвярджэнне савецкай гістарыяграфіі аб тым, што менавіта партызанскі рух вымагаў размяшчэння ў тыле значных вайсковых сілаў немцаў. Па сучасных падліках гэта колькасць не перавышала 3,8 % ад нямецкіх салдат, якія ў кастрычніку 1943 г. знаходзіліся на захопленай тэрыторыі СССР. Да лічбы ў 100 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў неабходна дадаць такую ж лічбу мясцовага насельніцтва, якое знаходзілася на службе ў немцаў. Аспрэчвае аўтар і лічбу аб колькасці немцаў, забітых партызанамі ў тылавой зоне армейскіх груп. На думку А. Бракеля, на працягу вайны савецкія партызаны і падпольшчыкі забілі менш нямецкіх салдат, чым іх гінула цягам аднаго месяца на ўсходнім фронце (каля 60 тыс. чалавек). Хаця на прыкладзе Баранавіцкай вобласці, як падкрэслівае аўтар, неабходна весці размову аб адным з мацнейшых цэнтраў савецкіх партызан на тэрыторыі Беларусі (с. 341).

Пэўная ўвага ў манаграфіі ўдзелена малавывучаным пытанням, звязаным у тым ліку з наступствамі партызанскага руху для мясцовага

мірнага насельніцтва. Даследчык імкнецца выявіць тыя стратэгіі паводзін, якія ва ўмовах фактычнага знаходжання мірнага насельніцтва паміж сіламі савецкага ўзброенага супраціўлення, байцамі падраздзяленняў Арміі Краёвай і службамі германскага акупацыйнага рэжыму садзейнічалі выжыванню мірнага насельніцтва ва ўмовах мірнай і ваеннай паўсядзённасці на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці. Адказваючы на гэтыя і іншыя пытанні, якія вынікаюць з прыведзенага ў даследаванні вялікага корпусу новага дакументальнага матэрыялу, аўтар прыходзіць да шэрагу важных высноў, у тым ліку да такой: на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці большасць насельніцтва спрабавала па магчымасці прыстасавацца да супярэчлівых умоў ваеннай паўсядзённасці і вяло сябе пасіўна, маючы на мэце толькі адно – любым чынам перажаць вайну (с. 375).

Заключная сёмая частка "Жыццё ва ўмовах панавання двух рэжымаў" (с. 381–387) прадстаўляе чытачу высновы, да якіх прыйшоў у даследаванні А. Бракель. У час германскай акупацыі мясцовае насельніцтва знаходзілася ва ўмовах напружанага трохкутніка: нямецкай акупацыйнай улады і дзвюх антаганістычных падпольных груп, калі ваенная штодзённасць садзейнічала расколу грамадства. Пры гэтым аўтар аспрэчвае думку вядомага нямецкага гісторыка Б. К'яры аб "суцэльнай атамізацыі ваеннага грамадства" (с. 387). Пасля трохгадовай германскай акупацыі для большасці стала відавочным тое, што практычна кожны быў гатовы заплаціць любую цану, каб да людзей зноў вярнулася мірнае жыццё.

Такім чынам, даследчыку ўдалося паспяхова рэалізаваць пастаўленыя задачы і прапанаваць нямецкамоўнаму чытачу даволі ўсебаковую карціну штодзённага жыцця беларускага насельніцтва Баранавіцкай вобласці ў гады Другой сусветнай вайны. Несумненная заслуга А. Бракеля палягае ў працягу навуковага дыскурсу, пачатага ў другой палове 1990-х гг. Б. К'яры па даследаванні гісторыі "ваеннай штодзённасці" Беларусі. Важнай адметнасцю працы з'яўляецца выяўленне сутнасці бальшавіцкай і нацысцкай палітыкі, паказанай аўтарам на прыкладзе рэгіянальнай гісторыі Беларусі і падмацаванай вялікім колам новых дакументальных крыніц. Унікальнай адметнасцю навуковага даследавання можна лічыць удалую спробу правядзення параўнаўчага аналізу наступстваў той палітыкі, якую праводзілі розныя дзяржавы для жыцця беларускіх грамадзян ва ўмовах мірнай і ваеннай штодзённасці. У працы абгрунтаваны тэзіс аб важнасці выяўлення спецыфікі існавання беларускага грамадства ва ўмовах панавання розных палітычных рэжымаў. Грунтоўная манаграфія А. Бракеля, несумненна, павінна паслужыць імпульсам для далейшага вывучэння рэгіянальнай гісторыі Беларусі ў гады германскай акупацыі. Адной з актуальных задач для сучаснай беларускай навукі з'яўляецца яе пераклад на беларускую мову.

*Паступіла ў рэдакцыю 24.01.11*